*М.М.КАРАЛЁЎ*

# АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ ПАДРЫХТОЎКІ МЕНЕДЖЭРАЎ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ

Сучасная сацыяльна-культурная сітуацыя, патрэбнасць адраджэння беларускай нацыянальнай культуры зрабілі вельмі актуальнай задачу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для сферы культуры. Асноўнымі прычынамі, якія не дазваляюць у поўнай меры рэалізаваць гэтую задачу, з'яўляюцца:

— нераспрацаванасць тэарэтычнай канцэпцыі развіцця культуры ва ўмовах рынку;

— адставанне існуючай метадалогіі і структуры вышэйшай школы ад міжнароднага вопыту падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы;

— адсутнасць сацыяльнага заказу на падрыхтоўку спецыялістаў для сферы культуры на перспектыву.

Зыходзячы з вышэйсказанага і ўсведамляючы, што культура з'яўляецца сёння прыярытэтным кірункам адраджэння і духоўнага аб'яднання нацыі, а таксама сродкам уваходу ў сусветную цывілізацыю, пераадоленне крызісу сістэмы культуралагічнай адукацыі, яе развіццё бачыцца ў:

— адмаўленні ад неапраўдаўшых сябе стэрэатыпаў культурна-асветніцкай адукацыі, адраджэнні нацыянальных формаў традыцыйнай культуры і агульначалавечых каштоўнасцей;

— карэннай змене структуры ВНУ, пераходзе ад існуючых падраздзяленняў (кафедры, прадметна-метадычныя камісіі) да якасна новых кірункаў аўтарскай педагогікі (творчыя семінары, праблемныя лабараторыі, мастацкія майстэрні) у форме часовых творчых калектываў, што ствараюцца пад перспектыўныя кірункі і канкрэтныя задачы;

— руплівым пераглядзе набору спецыялізацый, па якіх вядзецца навучанне ў ВНУ, зыходзячы не толькі з сённяшняй сацыяльна-культурнай сітуацыі, але ў большай ступені заснаваных на навуковым прадбачанні тэндэнцый далейшага функцыянавання сацыякультурнай сферы.

Спецыфіка культуралагічнай адукацыі ў тым, што яна павінна не толькі адлюстроўваць, але і апераджаць сацыякультурнае развіццё грамадства, каб апошняе праз культуру мела магчымасць лепш падрыхтавацца да ўспрымання новых ідэй і грамадскіх адносін. Сучаснае пакаленне ў трэцім тысячагоддзі арыентуецца на тыя каштоўнасці, якія навучальная ўстанова ў іх выхоўвае.

Вельмі важнае значэнне для вырашэння гэтай задачы мае ўваход Беларусі ў еўрапейскае і сусветнае супольніцтва. Кадры, якія мы рыхтуем, павінны быць канкурэнтна здольнымі, і таму патрэбна арыентавацца на сусветныя адукацыйныя і прафесійныя стандарты. Па гэтай прычыне падрыхтоўка спецыялістаў у галіне культуры павінна прадугледжваць:

1) веданне імі гісторыі і этапаў развіцця прафесіі, звязанай з арганізацыяй вольнага часу і адпачынку;

2) авалоданне тэорыяй і філасофіяй культуры, асаблівасцямі арганізацыі вольнага часу;

3) веданне чалавечых і прыродных рэсурсаў, іх суаднесенасці з вопытам арганізацыі вольнага часу;

4) знаёмства з рэгіянальнымі, рэспубліканскімі і міжнароднымі законамі і актамі ў галіне культуры і іх уплывам на адпачынкава-забаўляльную дзейнасць;

5) веданне формаў арганізацыі вольнага часу, тэхнічных прыёмаў яго арганізацыі, механізмаў планавання, уключаючы выяўленне аб'ектыўных прынцыпаў, выбар зместу дзейнасці, вызначэнне стратэгічных перспектыў, забеспячэнне патрабуемых рэсурсаў і распрацоўку доўгатэрміновых планаў;

6) засваенне прыёмаў групавой і індывідуальнай дзейнасці ў сферы культуры, арганізацыі адпачынкава-забаўляльнай дзейнасці;

7) разуменне студэнтамі адказнасці ўстаноў культуры і мастацтва ў рабоце з інвалідамі і асобнымі групамі насельніцтва;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8) знаёмства з канцэпцыямі правядзення вольнага часу ў розных краінах, што дазваляе эфектыўна планаваць, арганізоўваць і праводзіць культурна-масавую работу сярод насельніцтва;

9) веданне прынцыпаў і метадаў кіравання, маючы на ўвазе планаванне, маркетынг, прафесійныя заняткі, узроставыя асаблівасці розных груп насельніцтва, фінансаванне, грамадскія і працоўныя адносіны, прыняцце рашэнняў і іх ажыццяўленне, фарміраванне сацыяльна-псіхалагічнага клімату ў калектыве;

10) веданне ролі і функцый адукацыі ў сферы культуры, арганізацыі розных формаў культурна-адпачынкавай дзейнасці, узаемасувязі ў працэсе работы органаў кіравання ў галіне культуры і вольнага часу з грамадскімі арганізацыямі;

11) набыццё ўменняў па назапашванні прафесійнага вопыту ў арганізацыі вольнага часу.

Улічваючы гэыя патрабаванні, уяўляецца магчымым абгрунтаваць кірункі падрыхтоўкі кадраў па спецыялізацыі Г. 01.01.06 "менеджмент сацыяльна-культурнай сферы".

Валодаючы інавацыйнымі тэхналогіямі арганізацыі сацыякультурнай і прадпрымальніцкай дзейнасці, ведамі ў сферы менеджменту, маркетынгу, рэкламы, эканомікі, айчыннага і замежнага права, знешнеэканамічнай дзейнасці, інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі, замежнымі мовамі, менеджэр сацыякультурнай сферы павінен вырашаць пытанні развіцця культуры за кошт выкарыстання розных сродкаў фінансавання, матэрыяльных і чалавечых рэсурсаў.

Працэс навучання зарыентыраваны на глыбокую агульнагуманітарную і культуралагічную падрыхтоўку спецыялістаў па сусветных адукацыйных і прафесійных стандартах.

Падрыхтоўка менеджэраў ажыццяўляецца з улікам трох узроўняў:

1) адміністрацыйнага (вобласць, раён, горад, метадычныя і кіруючыя структуры) – выпускнікі магістратуры;

2) кіруючага (дырэктар, адміністратар устаноў культуры) – спецыялісты з вышэйшай адукацыяй;

3) арганізацыйнага (лідэр, арганізатар праграмы) — бакалаўры.

Дзеля высакаякаснай падрыхтоўкі спецыялістаў па гэтых кірунках прынята ў якасці прыярытэтнай такая мадэль адукацыі, якая пабудавана на метадалогіі і методыках, што забяспечваюць фарміраванне прафесійных ведаў і развіццё творчых магчымасцей асобы. На першым этапе на працягу чатырох гадоў студэнт вывучае блок гуманітарных дысцыплін, якія забяспечваюць фундаментальную агульнакультурную і агульнапрафесійную падрыхтоўку і арыентуюць на засваенне нацыянальнай культуры. Гэта сусветная і нацыянальная гісторыя, літаратура, гісторыя філасофіі, логіка, рыторыка, гісторыя культуры, мастацкая культура Беларусі, замежная мова і інш.

У той жа час студэнт атрымлівае і фундаментальную прафесійную падрыхтоўку ў межах спецыялізацыі па такіх прадметах, як сацыякультурная дзейнасць, менеджмент, маркетынг, рэклама ў сферы культуры, эканоміка і фінансаванне сацыякультурных праграм, інфарматыка і вылічальная тэхніка, прававыя асновы кіравання, кіраванне ў галіне культуры за мяжой і інш.

З трэцяга курса студэнт атрымлівае спецыялізаваныя веды, набывае ўменні для дзейнасці ў пэўных сферах, галінах сацыякультурных устаноў.

Заканчваецца гэты этап навучання тэарэтычным даследаваннем па першым блоку дысцыплін і дыпломнай работай прыкладнога характару па даследаванні канкрэтнага вопыту. Засвоены курс адукацыі дае падставу для выдачы дыплома бакалаўра гуманітарных навук.

Блок дысцыплін пятага курса для атрымання дыплома спецыяліста з вышэйшай адукацыяй суадносіцца з тымі ведамі бізнесу ў сацыякультурнай сферы, якія ў многіх цывілізаваных краінах пры ўмелай арганізацыі з'яўляюцца рэнтабельнымі.

На апошніх курсах студэнт па асабістым жаданні выбірае для сябе вузкую спецыялізацыю, зыходзячы з пералічаных відаў дзейнасці:

1) шоу-бізнес (менеджэр і прадзюсер канцэртна-відовішчных праграм);

2) кіна-, відэапракат (прадзюсер, менеджэр кіна-, відэапракату);

3) менеджмент культурнага турызму (менеджэр сферы турызму);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) спартыўна-аздараўленчы бізнес (менеджэр спартыўна-аздараўленчай дзейнасці);
5) музейнавыставачная дзейнасць (менеджэр музейна-выставачнай дзейнасці);
6) тэлебачанне, радыё і сродкі масавай інфармацыі (менеджэр тэлебачання і радыё);
7) public relations — рэклама і грамадскія сувязі (менеджэр па рэкламе і public relations);
8) прадзюсерства ў сферы выяўленчага мастацтва (прадзюсер галерэйнай справы);
9) менеджмент міжнародных культурных сувязей (менеджэр па міжнародных культурных сувязях);
10) менеджмент мадэльнага шоу-бізнесу (менеджэр мадэльнага шоу-бізнесу);
11) менеджмент кіна-, відэавытворчасці (прадзюсер, менеджэр кіна-, відэавытворчасці);
12) менеджмент грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў (менеджэр грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў);
13) арганізацыя і методыка культурна-адпачынкавай дзейнасці (менеджэр культурна-адпачынкавай дзейнасці).

У адпаведнасці са зменай сацыякультурнай сітуацыі пералік прафілізацый дапаўняецца і змяняецца.

У змест падрыхтоўкі ўводзяцца дысцыпліны, якія будуць даваць магчымасць працаваць і на сумежных пасадах. Напрыклад, менеджэр канцэртна-відовішчных праграм зможа быць і сцэнарыстам-пастаноўшчыкам, менеджэр у сферы турызму — экскурсаводам-інструктарам і г. д.

Студэнты, праявіўшыя здольнасці да навуковай і навукова-творчай працы і вылучаныя кафедрамі і саветам факультэта, працягваюць адукацыю ў магістратуры па спецыяльнасці "культуралогія".

Каб атрымаць дыплом магістра, неабходна вывучаць некалькі абавязковых (3—4) дысцыплін і не менш за пяць дысцыплін на выбар. На гэтым этапе вельмі важныя спецкурсы і спецпрактыкумы па заяўках магістрантаў. Завяршаецца ён тэарэтычным даследаваннем у рамках выбранай спецыяльнасці. Студэнтаў, атрымаўшых дыплом магістра, можна рэкамендаваць для паступлення ў аспірантуру, для працы выкладчыкамі ВНУ, у навукова-метадычных цэнтрах, органах кіравання культуры.

Вельмі важным кірункам падрыхтоўкі менеджэраў сацыяльна-культурнай сферы з'яўляецца навукова-даследчая работа студэнтаў і выкладчыкаў. У 2000 г. завершана праца над актуальнай пяцігадовай тэмай "Аптымізацыя працэсу падрыхтоўкі менеджэраў сацыякультурнай сферы (СКС) ва ўмовах пераходу да многаўзроўневай сістэмы адукацыі".

Зараз кафедра менеджменту сацыякультурнай сферы БДУ культуры выконвае дзве тэмы "Навукова-метадычнае забеспячэнне падрыхтоўкі менеджэраў СКС" (навуковы кіраўнік дацэнт М.М.Каралёў) і "Інавацыйныя тэхналогіі ў арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці" (навуковы кіраўнік дацэнт М.І.Аксюцік).

Значны ўклад у падрыхтоўку навуковых кадраў уносіць аспірантура. Так, паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю ў бягучым годзе А.А.Макарава на тэму "Функцыянальна-структурныя пераўтварэнні ў дзейнасці клубных устаноў у Беларусі". Падрыхтаваны да абароны дысертацыі С.Б.Майсяйчук "Сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя дзяцей-інвалідаў" і Н.В.Гарустовіч "Прадзюсерская дзейнасць у сучаснай сацыякультурнай сферы Рэспублікі Беларусь".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ